***Праца са слоўнікавым словам*** <u>***цвісці.***</u>
На дошцы зроблены запіс.

| 5 | 3 | 2 | 1 | 4 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| ц | і | в | ц | с | і |

— Расшыфруйце слова. Што можа цвісці? *Цвісці* — слоўнікавае слова. Мы навучымся правільна яго пісаць. Паслухайце, як я вымаўлю слова: [ц'в'іс'ц'і]. Вымавіце яго ўслед за мной. Назавіце па парадку гукі ў гэтым слове. Вызначыце ў слове націскны склад. Які галосны гук вымаўляецца ў ненаціскным складзе? Назавіце мяккія зычныя гукі ў слове. Прачытайце слова на с. 39 падручніка. Якая літара галоснага гука пішацца ў ненаціскным складзе? Ці перадаецца мяккасць першага і чацвёртага гукаў у слове на пісьме? Вымавіце слова так, як яго трэба запісаць. Запішыце слова.

**III. Замацаванне.**

<u>Практыкаванне 67.</u>

— Падбярыце да першай схемы спалучэнні слоў, якія ёй адпавядаюць. Запішыце гэтыя спалучэнні слоў у адзін слупок. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія выконваюць заданне ў сшытках. Вучань каля дошкі вызначае лік і склон прыметнікаў, тлумачыць выбар канчаткаў.) У якой форме ліку і склону ўжыты прыметнікі ў запісаных спалучэннях слоў? *(У форме множнага ліку творнага склону.)* Падбярыце да другой схемы спалучэнні слоў, якія ёй адпавядаюць. Запішыце гэтыя спалучэнні слоў у другі слупок. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія выконваюць заданне ў сшытках. Вучань каля дошкі вызначае лік і склон прыметнікаў, тлумачыць выбар канчаткаў.) У якіх формах ліку і склону ўжыты прыметнікі ў запісаных спалучэннях слоў? *(У форме множнага ліку давальнага склону і ў форме адзіночнага ліку творнага склону.)* У якіх слупках аказаліся спалучэнні слоў з прыметнікамі ў форме творнага склону? Чаму так атрымалася?

<u>Праца з рубрыкай «Гаварыце правільна!».</u>

— Прачытайце словы ў рубрыцы на старонках 37 і 40. Звярніце ўвагу на націск у іх. Чым вымаўленне прыметнікаў *старым*, *родным*, *маленькім* *(старымі, роднымі, маленькімі)* у беларускай мове адрозніваецца ад вымаўлення адпаведных прыметнікаў у рускай мове? *(Націскам.)* Складзіце сказ з адным з гэтых прыметнікаў. Сачыце за правільным вымаўленнем слоў у сказах. (Выслухоўваюцца адказы вучняў.)

**IV. Інфармаванне аб дамашнім заданні, інструктаж па яго выкананні.**

Дамашняе заданне. Практ. 64.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе запісаць сказы, ужываючы прыметнікі ў дужках у патрэбнай форме. Акрамя таго, трэба будзе вызначыць склон прыметнікаў, абазначыць іх канчаткі.

**V. Вынік урока.**

— Калі прыметнікі ў форме множнага ліку давальнага склону маюць канчатак ***-ым (-ім)***? У якой яшчэ форме ліку, роду і склону прыметнікі маюць такія ж канчаткі? Калі прыметнікі ў форме множнага ліку творнага склону маюць канчатак ***-ымі (-імі)***?

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Мазго, У.* Прыгоды марахода / Уладзімір Мазго. — Мінск : Юнацтва, 2002. — 126 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://pixabay.com/ru.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Рэспубліка Беларусь*

*1. Сярод прапанаваных складоў адшукайце і зафарбуйце тыя, з якіх можна скласці назву нашай краіны. Злучыце склады так, каб атрымалася назва краіны.*

Рэ  бли  бе  ло

Ре  спу  ка  ла

ре  блі  Бе  русь

*2. Прачытайце тэкст. Дапоўніце яго патрэбнымі словамі. Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.*

Наша Радзіма — ________ ________. Горад-герой Мінск — сталіца ________ ________.

Усе мы — грамадзяне ________ ________. У нашай краіне жывуць людзі розных нацыянальнасцей: беларусы, рускія, украінцы, яўрэі, палякі, татары.

Дзяржаўныя мовы ________ ________ — беларуская і руская.

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

*3. Дапоўніце тэкст слоўнікавым словам.*

Зубр еўрапейскі

Зубр, ён і ёсць зубр! Асілак. Волат. Жывы сучаснік маманта.

Сёння лясныя волаты жывуць не толькі ў Белавежскай пушчы, але і ў Бярэзінскім і Прыпяцкім запаведніках, у Барысаўскім лясгасе. Зубр — прадстаўнік не сучаснай экалагічнай эпохі, і яго існаванне без дапамогі чалавека наўрад ці магчыма. Маладыя зубры могуць стаць ахвярай мядзведзя або ваўка. Зараз у ____цы_____ жыве больш за 500 зуброў.

*(Віктар Гардзей* [1, с. 39–40]*)*

*Дзе на Беларусі можна сустрэць зубра? Чым ён адметны? Чаму зубру патрэбна дапамога чалавека? Падкрэсліце словы, блізкія па значэнні да слова* ***здаравяк****.*

*4. Прачытайце словы. Закрэсліце лішнія літары ў дужках. Растлумачце свой выбар.*

(Б/б)еларусь, (Р/р)эспубліка (Б/б)еларусь.

*Прачытайце. Дапоўніце верш патрэбным словам.*

Плыве ў блакіце белы бусел,
І луг квяцісты, як абрус.
А мы з табою — беларусы,
Радзіма наша — ____________!

*(Міхась Пазнякоў* [2, с. 19]*)*

***Квяцісты*** *— з вялікай колькасцю кветак, пакрыты кветкамі.*

*5. Карта якой краіны прадстаўлена перад вамі? Запішыце назву краіны і яе сталіцы.*



### *Калектыў*

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 6 | 2 | 8 | 4 | 7 | 3 | 5 | 1 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| т | а | ў | е | ы | л | к | к |

*Падзяліце слова для пераносу рознымі спосабамі.*

*2. Закрэсліце лішнія літары. Расшыфруйце слоўнікавае слова.*

КОАОЛОЕОКОТОЫОЎО

*Запішыце слоўнікавае слова, падзяліце яго рыскамі | на склады. Абазначце ў слове націск, падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*3. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

[о] [в] [ў] [а]

к[..]лекты[..]

*4. Дапоўніце сказ патрэбным словам.*

Група людзей, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі, агульнай дзейнасцю, — гэта _________.

*У слоўнікавым слове назавіце гук, якога няма ў рускай мове.*

*5. Прачытайце. Дапоўніце прыказку слоўнікавым словам. Чаму так гавораць?*

Што аднаму не пад сілу, тое лё(г, х)ка _______.

*Якую літару трэба ўставіць у слова? Закрэсліце непатрэбную літару ў дужках. Назавіце праверачнае слова.*

*6. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Я старастам выбрана. Час не марнуем:
Мы з месяц ужо
____________ свой гартуем.

Удачы і ўсе непаладкі
У сшытак запісваю я
Па парадку.

*(Мікола Чарняўскі* [3, с. 83]*)*

***Гартава́ць*** *— выхоўваць стойкасць, вынослівасць, здольнасць пераносіць цяжкасці.*

*Раскажыце, якія агульныя справы ёсць у вашым калектыве.*

### *Герой*

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 2 | 4 | 3 | 5 | 1 |
|---|---|---|---|---|
| е | о | р | й | г |

*Абазначце ў слове націск, падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

[е] [і] [я]

г[..]рой

*3. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*




*Запішыце слова, якое «схавалася» ў слоўнікавым слове. Растлумачце значэнне гэтага слова.*

*4. Прачытайце. Дапоўніце прыказку слоўнікавым словам. Чаму так гавораць?*

Хто за Радзіму гарой — той сапраўдны ______.

*5. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам. Пра які помнік ідзе размова ў вершы? У якім месцы Мінска знаходзіцца гэты помнік?*

### Дзяўчаты мыюць танк

Дзяўчаты мыюць танк
ля дома афіцэраў.
Стаіць __________ атак
на пастаменце шэрым.

Даўно закончан бой,
і танк астыў ад злосці,
стаў славай гарадской
і часткай прыгажосці.
*(Пімен Панчанка* [4]*)*

*Падкрэсліце словы ў вершы, якія дапамагаюць уявіць танк жывой істотай.*

*6. Гульня «Лесвіца». «Спусціцеся» па лесвіцы і дапішыце патрэбныя словы. Зафарбуйце радок, у які ўпісана слоўнікавае слова.*

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| г | | р | о | й | | | |
| г | | | а | і | з | м | |
| | | | | | с | к | і |

*Прачытайце. Дапоўніце кожны радок патрэбным словам з «лесвіцы» слоў.*

Смяльчак, храбрэц, ____________.
Смеласць, храбрасць, ____________.
Смелы, храбры, _________________.

*7. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам. Што сімвалізуе Вечны агонь?*

### Ля Вечнага агню



Вечны агонь... —
Гэта светлая памяць
Радзімы
Пра бессмяротных
________яў яе.
Гэта —
Наша гатоўнасць
Быць імі.
Гэта —
Наша пракляцце
Вайне. *(Міхась Пазнякоў* [2, с. 33]*)*

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі.*

*Дзе ў Мінску гарыць Вечны агонь?*

### Медаль

1. Разблытайце «павуціну» і запішыце слоўнікавае слова.




*Запішыце слова, якое «схавалася» ў слоўнікавым слове.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

е я

м .. даль

*Абазначце ў слове націск, падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*3. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам. Калі адзначаецца свята Перамогі? За што атрымаў узнагароды прадзед хлопчыка?*

### Праўнук Перамогі

Іду я з прадзедам сваім,
іду на свята Перамогі.
Дзядуля ў фрэнчы франтавым,
даўно пажухлым,
ды зусім
не пацямнелі ўзнагароды —
і ордэны, і __________*і*
блішчаць, як сонейка, як зоры,
нібыта іх яму далі
не шмат гадоў таму, а ўчора.
*(Іван Муравейка* [5]*)*

***Фрэнч*** *— прыталеная куртка ваеннага крою з чатырма накладнымі кішэнямі і хлясцікам ззаду.*

**П = М**



*4. Разгадайце рэбус.*

*Дапоўніце спалучэнне слоў слоўнікавым слова, якое атрымалася.*

залаты ______________


**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Гардзей, В. К.* Малая дзіцячая Чырвоная кніга / Віктар Гардзей. — Мінск : Беларусь, 2008. — 116 с.
2. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
3. *Чарняўскі, М. М.* Як зрабіць вясёлым дзень : вершы, казкі, гумарынкі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. М. Чарняўскі. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. — 104 с.
4. Вясёлка. — 2009 — № 7. — С. 2.
5. Вясёлка. — 2010. — № 5. — С. 2.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://upload.wikimedia.org/wikipedia/commons/thumb/6/64/Belarus_provinces_blank1.svg/800px-Belarus_provinces_blank1.svg.png; *https://pbs.twimg.com/profile_images/378800000000768354/749eaf87d0c8b6993377335be1c7a389_400x400.png*; http://photos.wikimapia.org/p/00/05/72/59/77_big.jpg; *https://us.123rf.com/450wm/lightvisionftb/lightvisionftb1411/lightvisionftb141100032/33517502-bicycle-cartoon-colorful-isolated-on-white-background.jpg?ver=6.*



***Свірыдзенка В. І.****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*